ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 7 (802) ● Чацвер, 25 лютага 1971 г. Цана 2 кап. ● Год выдання XXIV

## І ЎДЗЯЧНАСЦЬ, І ЛЮБОЎ ТАБЕ, РОДНАЯ АРМІЯ!

Штогод дзень 23 лютага ва універсітэце, як і ва ўсёй краіне, — вялікая ўрачыстасць. І сёлета напярэдадні знамянальнай даты на факультэтах адбыліся вечары, літаратурныя канферэнцыі, прысвечаныя нашай слаўнай Арміі, яе гарачым воінам.

У дзень свята вялікая група студэнтаў выехала ў госці да воінаў падшэфнай часці.

Універсітэцкая моладзь з вялікай цікавасцю гутарыла з выдатнікамі баявой і палітычнай падрыхтоўкі, якія расказалі пра салдацкія будні, пра вучобу і адпачынак, пра тое, як яны авалодваюць складаным ваенным майстэрствам.

Фізікі і гісторыкі сустрэліся з групай маладых афіцэраў, былых выпускнікоў БДУ, якія праходзяць службу ў радах Савецкай Арміі.

Каля 400 юнакоў і дзяўчат раніцай 23 лютага прыйшлі ў музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Тут яны сталі ўдзельнікамі вялікага святочнага мітынгу, слухалі непасрэдна каля экспазіцый поўныя гераізму і мужнасці расказы пра падзеі часоў Вялікай Айчыннай вайны, сустрэліся з праслаўленымі генераламі, Героямі Савецкага Саюза.

Вялікае ўражанне пакінулі прагледжаныя тут жа ў музеі кінастужкі хранікальных і ваенна-патрыятычных фільмаў.

☐ Напярэдадні свята Савецкай Арміі рэспубліканскі камітэт ветэранаў вайны ўзнагародзіў ваенную кафедру БДУ за актыўную работу па ваенна - патрыятычнаму выхаванню студэнтаў.

☐ З расказам аб нараджэнні Савецкіх Узброеных Сіл, іх слаўным і гераічным шляху перад замежнымі студэнтамі падрыхтоўчага факультэта выступіў выкладчык ваеннай кафедры, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны Сяргей Андрэевіч Сінякоў. Пасля сустрэчы яе ўдзельнікі прагледзелі дакументальны фільм «Старонкі бессмяроцця».

Напярэдадні Дня Савецкай Арміі супрацоўніку дэканата біяфака М. Ц. Жалезкіну ўручан нагрудны знак у гонар 25-годдзя перамогі над фашысцкай Германіяй і грамата Беларускага рэспубліканскага савета ветэранаў вайны за актыўную работу па выхаванню моладзі на баявых і рэвалюцыйных традыцыях.

**НА ЗДЫМКУ:** грамату ўручае старшыня савета ветэранаў БДУ А. В. Кірсанаў.



## РЫХТУЮЧЫСЯ ДА ЮБІЛЕЮ

**(З выступлення рэктара БДУ акадэміка А. Н. СЕЎЧАНКІ на сходзе актыву).**

У 1970-71 навучальным годзе ва універсітэце налічваецца 88 кафедр, на якіх плённа працуюць 1.333 навукова-педагагічныя работнікі, З іх вучоныя званні і ступені маюць 510 чалавек, у тым ліку: прафесараў, дактароў навук — 90, дацэнтаў, кандыдатаў навук — 420. Рост колькасці выкладчыкаў суправаджаўся павышэннем іх кваліфікацыі. Мы маем права ганарыцца гэтым ростам, у выніку якога лік выкладчыкаў вышэйшай кваліфікацыі амаль патроіўся: за апошнія пяць год апублікавана звыш 200 манаграфій, звыш 150 падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў. Звыш 4 тысяч навуковых артыкулаў.

За прайшоўшае дзесяцігоддзе навукова-педагагічнымі работнікамі абаронена 46 доктарскіх і 283 кандыдацкія дысертацыі.

Універсітэт — актыўны ўдзельнік развіцця навукі ў рэспубліцы. Ён уключан у лік 25 вядучых навучальных устаноў краіны. Цяпер пры універсітэце працуе 3 праблемныя і 11 даследчых галіновых лабараторый, вылічальны цэнтр, батанічны сад.

Універсітэцкія вучоныя ўнеслі значны ўклад ў развіццё ўсіх галін ведаў. Толькі за апошнія пяць год вучоныя універсітэта падалі 85 заявак на вынаходніцтвы, 52 з іх атрымалі аўтарскія пасведчанні. Свае поспехі універсітэт дэманструе на ВДНГ СССР.

У 1970 годзе выканана 367 даследаванняў, у тым ліку 36 па народнагаспадарчых планах рэспублікі і Саюза. Адначасова шырока вядуцца работы на аснове гаспадарчых дагавораў з прадпрыемствамі. Аб'ём гаспадарчых работ (па даходах) узрос з 379 тысяч рублёў у 1966 годзе да 1.800 тысяч у 1970 годзе.

Штогод расце аб'ём капітальных укладанняў на будаўніцтва вучэбных карпусоў і студэнцкіх інтэрнатаў. Далейшае развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы прадугледжвае ў першую чаргу стварэнне аўдыторнага і лабараторнага фондаў, неабходных для навучальнага працэсу і навуковай работы, будаўніцтва вучэбных і навуковых баз, папаўненне універсітэта сучасным вучэбным і навуковым абсталяваннем, забеспячэнне калектыву неабходнымі культурна-бытавымі ўстановамі. Будаўніцтва будзе весціся некалькімі чэргамі і разлічана на 10—15 год. На базе вучэбна-вопытных гаспадарак возера Нарач і Шчомысліцы будзе пабудаван шасціпавярховы будынак біёлага-геаграфічнай станцыі (Нарач) і вучэбна-навуковага камбіната (Шчомысліца). У комплекс «Шчомысліца» ўвойдуць па генеральнаму плану вучэбны корпус, дзевяціпавярховыя будынкі інстытутаў прыкладной фізікі і матэматыкі, абсерваторыя, бібліятэка на 750 тысяч тамоў, сталовая на 200 месц, дзевяціпавярховы 108-кватэрны жылы дом, інтэрнат на 1.212 месц, дзіцячы сад-яслі, паліклініка, спартыўны комплекс.

Многа зроблена ва універсітэце для павышэння ўзроўню вучэбна-выхаваўчага працэсу.

Зімовая экзаменацыйная сесія 1970-71 навучальнага года прайшла арганізавана, абсалютная паспяховасць у цэлым па універсітэту складае 90,3 працэнта. Аднак яшчэ нізкая паспяховасць студэнтаў першых курсаў. Тлумачыцца гэта тым, што дэканаты, кафедры не выконваюць тых дыдактычных рэкамендацый, якія былі дадзены вучэбнай часткай аб асаблівасцях работы з першакурснікамі.

На бягучую і канчатковую паспяховасць адмоўна ўплывае слабая працоўная дысцыпліна студэнтаў. Усё яшчэ вялікая колькасць пропускаў заняткаў без уважлівых прычын.

Для ліквідавання гэтых недахопаў неабходна перш за ўсё на факультэтах і кафедрах павышаць узровень метадычнай работы, якая забяспечвае разумнае планаванне вучэбных заняткаў, дазіроўку часу на самастойную работу студэнтаў, рацыянальнае размеркаванне і выкарыстанне працы выкладчыкаў, г. зн. звяртаць максімальную ўвагу на удасканаленне навучальнага працэсу. У гэтым навучаль-

*(Працяг на 2-й стар.).*

## СВЕДЧАЦЬ ВЫНІКІ СЕСІІ

Уся вучэбная, выхаваўчая і навуковая работа ў першым семестры праходзіла ва універсітэце ва ўмовах актыўнай падрыхтоўкі да XXIV з'езда КПСС. Правядзенне масава-палітычных мерапрыемстваў, прысвечаных дастойнай сустрэчы з'езда партыі, выклікала вялікі працоўны і творчы ўздым у калектывах студэнтаў, аспірантаў і навукова-педагагічных работнікаў і станоўча адбілася на выніках першага семестра.

У 1970-71 навучальным годзе ва універсітэце вучацца 16.940 студэнтаў. Гэта на 540 чалавек больш, чым у мінулым навучальным годзе. Павелічэнне кантынгенту студэнтаў ідзе за кошт пераважнага росту дзённай формы навучання.

Абсалютная паспяховасць у сярэднім па універсітэту павысілася ў прайшоўшым семестры да 90,3 працэнта супраць 89 у 1969-70 навучальным годзе. Колькасць студэнтаў, здаўшых экзамены на выдатна і добра, павялічылася адпаведна да 54,3 працэнта супраць 48,9.

Сярэдняя паспяховасць на прыродазнаўчых факультэтах — 88,4 працэнта, на гуманітарных — 93,9. Сярод прыродазнаўчых факультэтаў найбольш высокі працэнт паспяховасці на хімічным (90,6) і прыкладной матэматыкі (90,4), а сярод гуманітарных — на факультэце журналістыкі (98,4) і юрыдычным (95,2). Самая нізкая паспяховасць на матэматычным факультэце (81,1), а сярод гуманітарных — на філалагічным (90,7).

У параўнанні з мінулым годам панізілася паспяховасць на біялагічным, хімічным, фізічным і гістарычным факультэтах. Найбольш нізкая паспяховасць у студэнтаў I і II курсаў у асноўным фізічнага і матэматычнага факультэтаў. Гэта гаворыць аб тым, што калектывы некаторых кафедр і факультэтаў не здолелі забяспечыць выкананне пастановы савета універсітэта і рэктарата, не арганізавалі дапамогі першакурснікам па пераадоленню разрыву ў метадах навучання ў вышэйшай і сярэдняй школе, не змаглі навучыць іх арганізоўваць свой час і самастойна працаваць. Не была створана дакладна прадуманая сістэма кантролю за працай першакурснікаў, якая выключала б стыхійнасць і неарганізаванасць у іх самастойных вучэбных занятках.

На паспяховасць адмоўна ўплывае слабая працоўная дысцыпліна асобных студэнтаў. Ёсць выпадкі спазнення на заняткі, пропускі заняткаў без уважлівых прычын. Найбольшы лік пропускаў на філалагічным, біялагічным, фізічным і юрыдычным факультэтах.

Для ліквідацыі маючых месца недахопаў неабходна ў першую чаргу на ўсіх кафедрах і факультэтах павышаць узровень метадычнай работы.

У другім семестры дэканаты і кафедры павінны паставіць перад сабой задачу практычнага рашэння інтэнсіфікацыі навучальнага працэсу шляхам удасканалення спосабаў перадачы ведаў студэнтам, павышэння паспяховасці, бо гэта ў асноўным вызначае якасць падрыхтоўкі спецыялістаў.

Разам з гэтым неабходна больш прад'яўляць патрабавальнасці да студэнтаў, усяляк павышаць у іх пачуццё адказнасці за вучобу, за строгае падтрыманне дысцыпліны, за глыбокае авалоданне сваёй спецыяльнасцю.

Доўг усіх навукова-педагагічных работнікаў і студэнтаў—рыхтаваць дастойную сустрэчу XXIV з'езду КПСС і 50-годдзю універсітэта.

В. ДАЛГАРУКАЎ,
начальнік вучэбнага аддзела.

## ВОБРАЗ НЯГАСНУЧАЙ СІЛЫ

— Нашы равеснікі—маладыя, яснавокія, жыццярадасныя — яны не бачылі вайны. Але колькі горычы, нянавісці ў іх галасах, калі гучыць: «Не быць вайне!». — Гэта словы аднаго з удзельнікаў літаратурнай канферэнцыі «Вобраз савецкага воіна ў мастацкай літаратуры», прысвечанай 53-й гадавіне Савецкай Арміі.

Канферэнцыя адбылася ва універсітэце напярэдадні гэтай слаўнай даты. З уступным словам да прысутных звярнуўся ўдзельнік грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, Герой Савецкага Саюза Аляксандр Васільевіч Кірсанаў:

— Дарагія таварышы, мы жывём у цудоўны час. Аб гераічным мінулым Бацькаўшчыны моладзь ведае з кніг... Але давайце падумаем, ці дастаткова ўвагі звяртаюць нашы пісьменнікі на асвятленне вялікага подзвігу савецкага салдата, самага сціплага і самага гуманнага воіна на зямлі...

Сапраўды, ці дастаткова мы ведаем аб мужным змаганні нашых бацькоў, якія вырагавалі свет ад чорнага фашызму! Ці ясна ўсведамляем непарыўную сувязь фронту і тылу, кіруючую ролю партыі ў барацьбе!

Пачынаецца шчырая размова двух пакаленняў (на канферэнцыі прысутнічалі былыя воіны, зараз відныя грамадскія дзеячы, навуковыя работнікі і тыя, каму зараз каля 20-ці — студэнты Беларускага дзяржаўнага універсітэта).

Студэнт філфака А. Соніч з абурэннем гаворыць аб звярынай прыродзе фашызму. Ідучы на нашу зямлю, гітлераўцы хацелі знішчыць нас, сцерці з твару зямлі савецкі народ і яго культурныя здабыткі. Сотні тысяч людзей загінулі ў крэматорыях і лагерах смерці.

— Мы памятаем і павінны памятаць, якой цаной дасталося нам наша шчасце,— гаворыць студэнт фізфака С. Чырвонін.

У першыя дні вайны гераічна загінуў зусім малады лётчык Мікалай Гастэла. Адважна пайшоў на таран Віктар Талаліхін. Закрыў грудзьмі варожы кулямёт Аляксандр Матросаў. Успамінаюцца імёны, подзвігі, даты... За ўсім гэтым — моцная воля савецкага салдата, які здолеў з'яднаць у сваім сэрцы такія процілеглыя пачуцці, як любоў і нянавісць. Ён ненавідзеў ворагаў і любіў Гётэ, Шылера, Баха, ненавідзеў вайну і любіў сваю светлую мару аб мірным будучым чалавецтва.

І зноў бярэ слова праслаўлены ветэран А. В. Кірсанаў. Ад імя свайго пакалення, ад імя тых, каму пашчаслівілася выжыць на франтах грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, ён дзякуе моладзі 70-х гадоў за светлую памяць аб подзвігу савецкага салдата.

Н. САЛУК.

# РЫХТУЮЧЫСЯ ДА ЮБІЛЕЮ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).*

ным годзе дэканаты і кафедры павінны па-сапраўднаму здзейсніць даследаванне такіх навукова-метадычных праблем, як:

1. Даследаванне і праектаванне бюджэту часу студэнтаў як асновы планавання ўсяго вучэбна-выхаваўчага працэсу.
2. Распрацоўка навуковых прынцыпаў і метадаў пабудовы навучальнага працэсу ў часе.
3. Распрацоўка метадаў планавання аб'ёмаў пазааўдыторнай самастойнай работы студэнтаў.
4. Забеспячэнне навучальнага працэсу тэхнічнымі сродкамі, г. зн. практычна рашаць задачу інтэнсіфікацыі навучальнага працэсу праз удасканаленне спосабаў перадачы ведаў на аснове комплекснага выкарыстання тэхнічных сродкаў навучання.

Па-другое, з мэтай павышэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў, якія адпавядаюць сучасным патрабаванням, асноўную ўвагу дэканатаў, загадчыкаў кафедр і ўсіх выкладчыкаў варта сканцэнтраваць на ўдасканаленні вучэбных праграм, на пераглядзе зместу лекцый і спецкурсаў, на ўключэнні ў іх новых, даных, атрыманых у выніку навейшых даследаванняў і дасягненняў практыкі, на старанным адборы матэрыялаў для вывучэння. Трэба часцей абмяркоўваць лекцыі, арганізоўваць узаеманаведванне заняткаў, г. зн. усё рабіць для таго, каб узровень ведаў студэнтаў і іх паспяховасць непарыўна павышаліся.

Па-трэцяе, дэканатам, загадчыкам кафедр і ўсім выкладчыкам варта больш удзяляць увагі кантролю за бягучай паспяховасцю студэнтаў малодшых курсаў на аснове рэкамендацый, распрацаваных вучэбным аддзелам.

З мэтай павышэння паспяховасці студэнтаў неабходна больш актыўна прыцягваць студэнтаў малодшых курсаў да прасцейшых навуковых даследаванняў па заданнях кафедр, даручаць гэтую работу найбольш кваліфікаваным выкладчыкам.

У апошнія гады ва універсітэце многае зроблена ў пастаноўцы камуністычнага выхавання студэнцкай моладзі. Студэнты, прыняўшыя ўдзел у працоўным семестры, атрымалі высокую ацэнку за праяўленыя працоўныя намаганні. Значна павысілася грамадская актыўнасць, скараціліся выпадкі амаральных учынкаў. Але дасягнутыя поспехі не могуць нас заспакойваць. Пытанні выхавання студэнтаў не павінны сыходзіць з павесткі пасяджэнняў саветаў факультэтаў, кафедр і грамадскіх арганізацый.

Вялікія задачы стаяць перад камсамольскімі арганізацыямі, якім галоўную ўвагу неабходна сканцэнтраваць на палітычным выхаванні моладзі, фарміраванні камуністычнага светапогляду, на ўсебаковым развіцці асобы маладога чалавека. Трэба звярнуць асаблівую ўвагу на тую частку студэнцкай моладзі, якая парушае працоўную дысцыпліну, не беражэ народнае дабро, рашуча змагацца з п'янствам, хуліганствам, антыграмадскімі ўчынкамі.

Неабходна забяспечыць авангардную ролю камсамольцаў у вучобе, таму што вучоба студэнта ва універсітэце ёсць яго праца. Доўг кожнага студэнта-камсамольца — паспяхова выканаць абавязацельствы на дастойнай сустрэчы партыйнага з'езда і паспяхова закончыць 1970-71 навучальны год.

Звяртаюся да ўсіх выкладчыкаў, аспірантаў, студэнтаў і супрацоўнікаў з заклікам актыўна ўключыцца ў выкананне мерапрыемстваў па павышэнні культуры і эстэтыкі вытворчасці, паляпшэнні умоў працы, быту і адпачынку студэнтаў і выкладчыкаў. Шырока разгарнуць спаборніцтва за лепшы факультэт, лепшую кафедру, лепшую лабараторыю, за лепшую вытворчую групу адміністрацыйна-гаспадарчай часткі, за лепшую студэнцкую акадэмічную групу, за лепшы студэнцкі інтэрнат.

Трэба звярнуць самую сур'ёзную ўвагу на выкананне сацыялістычных абавязацельстваў, узятых калектывам універсітэта ў сувязі з XXIV з'ездам КПСС і 50-годдзем універсітэта. Дэканам факультэтаў, партыйным і камсамольскім арганізацыям шырока абмяркоўваць ход выканання сацыялістычных абавязацельстваў і намечаных мерапрыемстваў. Усяму прафесарска-выкладчыцкаму саставу, студэнтам прыняць самы актыўны ўдзел у вывучэнні і прапагандзе матэрыялаў XXIV з'езда КПСС.

Сустракаючы знамянальную дату — 50-годдзе універсітэта, неабходна імкнуцца да таго, каб увесь калектыў універсітэта—выкладчыкі і студэнты актыўна ўдзельнічалі ў прапагандысцкай рабоце, прысвечанай 50-годдзю універсітэта. Гэта, у першую чаргу, даклады выкладчыкаў і студэнтаў у гарадах і сельскіх населеных пунктах рэспублікі, у школах, выступленні ў друку, прысвечаныя агульным задачам і перспектывам развіцця універсітэта.

Вось так набываецца вельмі важнае для журналіста ўменне друкаваць на машынцы.

Заняткі са студэнтамі журфака вядзе выкладчык **Г. А. Хадасевіч.**



# ЯКІМ БЫЦЬ АКТЫВІСТУ?

Актывісту далі даручэнне. Ці будзе яно выканана?

— Будзе, калі ўзяў, —скажуць многія.

Вось тут мне хочацца выказаць некаторыя меркаванні, хоць можа некалькі і суб'ектыўныя. Пачнем з таго, што на сходах выбралі камсамольскі актыў. Трапілі ў яго састаў розныя людзі.

Згодзен, што многія ведаюць свае абавязкі і адразу бяруцца за справу. Лягчэй таму, хто правучыўся ва універсітэце год-два. А што рабіць нам, першакурснікам? Многія ж з нас не ведаюць, з чаго пачынаць. Вось тут бы камітэту камсамола і падумаць аб вучобе, семінарах, гутарках.

Прайшоў першы семестр, але не заўважалася, каб хто-небудзь са старэйшых пацікавіўся справамі пачынаючых актывістаў. Многія групкамсоргі не ведаюць нават, як скласці план работы, аб чым весці размову на камсамольскім сходзе.

Прывяду адзін прыклад, каб мяне не абвінавацілі ў галаслоўнасці. Ёсць у нас на курсе камсорг Валерый Драздоў. Добры хлопец. Займаецца паспяхова. Але ніяк ён не можа наладзіць камсамольскую работу (ды ці адзін толькі ён).Звяртаўся Валерый да бюро курса. Дапамаглі ў чымсьці. Але камсорг адчувае, што гэтага вельмі мала. Хочацца большага, а дзе даведацца? Вось і апускаюцца тады ў нерашучасці рукі—зрабіць хочацца, а не ведае як.

Ніводнага разу камітэт камсамола не правяраў, як спраўляецца са сваёй работай бюро, камсоргі. Вельмі ж мала паслухаць справаздачу сакратара пярвічнай арганізацыі на пасяджэнні.

Я прыйшоў ва універсітэт з тэхнікума. Там камсамольская работа вялася па-іншаму. Кожны месяц камсоргі і актыў збіраліся на своеасаблівыя заняткі-семінары. Да работы прыцягваліся члены гаркома і нават абкома камсамола. Мноства спрэчных пытанняў вырашалася тут жа, на месцы. Гэта давала вынік — камсамольская работа ў групах была цікавай, энергічнай. Некалькі разоў там выступалі камуністы. Яны раілі, як лепш працаваць з моладдзю, дзяліліся сваім вопытам.

Няўжо ў нас на факультэце (можа, і ва універсітэце) нельга арганізаваць «Школу камсамольскага актывіста»? Па-мойму, ніхто б не адмовіўся яе наведваць.

Тады б, напэўна, у канцы года на справаздачных сходах, калі даецца ацэнка работы камітэта камсамола, можна было б гаварыць аб добрай адзнацы, а не задавальняцца пасрэднай.

Думаю, што над гэтым трэба сур'ёзна задумацца. Наладзіць камсамольскую работу, вучобу актывістаў — першачарговая, надзённая задача.

**У. СКУЛЬБЕДАЎ,**
**студэнт факультэта журналістыкі.**



Лабараторныя заняткі па неарганічнаму сінтэзу. Праводзіць дослед студэнтка IV курса хімфака Людміла **Гацкая.**
Фота **Д. Чаховіча.**

# ПАДПІСЧЫКІ ЗВЯРНУЛІСЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Нядаўна актыў рэдакцыі правёў рэйд праверкі распаўсюджання газеты «Беларускі універсітэт». Прымусілі зрабіць гэта неаднаразовыя скаргі падпісчыкаў, якія не атрымліваюць газет.**

Члены рэйдавай брыгады пабывалі на кафедрах, у аўдыторыях, гутарылі з супрацоўнікамі, выкладчыкамі, студэнтамі. Выявілася, што на факультэты газета дастаўляецца, як правіла, своечасова, у дзень выхаду або на наступны дзень і складваецца ў камітэтах камсамола. Здавалася б, адтуль няцяжка хутка даставіць яе ў дэканат, аўдыторыі, на кафедры і ў кабінеты. Аднак гэтага не адбываецца.

Дадзім слова фактам. **ХІМІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ.** Камітэт камсамола: газету атрымліваюць рэгулярна. Кафедра неарганічнай хіміі: у гэтым годзе атрыман толькі адзін нумар. **БІЯЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ.** Камітэт камсамола: газету атрымліваюць своечасова. Кафедра фізіялогіі раслін: газету выпісалі, але не атрымліваюць. **МАТЭМАТЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ.** Дастаўка і распаўсюджанне газеты сярод студэнтаў арганізаваны нядрэнна. Выкладчыкам на кафедры газеты не дастаўляюцца і ў камітэт камсамола за імі з кафедр ніхто не прыходзіць. **ГІСТАРЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ.** Гутарым з Таняй Нікіценка, студэнткай першага курса.

— «Беларускі універсітэт» здабыць можна толькі ў кіёску.

Тое ж гавораць многія студэнты геафака, фізфака, юрфака.

— На жаль, — дадае лабарант кафедры навуковага камунізма Ала Уладзіміраўна Цітова, — на кафедры і ў кабінеты таксама не дастаўляецца газета. Чарговыя нумары яе даводзіцца шукаць дзесьці ці звяртацца ў рэдакцыю.

Так, у рэдакцыю звяртаюцца вельмі многія. Просяць той ці іншы нумар або падшыўку. Між тым, пытанне аб арганізацыі дастаўкі газеты слухалася яшчэ ў мінулым годзе на аб'яднаным пасяджэнні рэктарата і парткома. У прынятым рашэнні сказана недвухсэнсоўна: «Дэканатам, партыйным і камсамольскім бюро факультэтаў арганізаваць своечасовую дастаўку газеты. Для гэтага выдзеліць на кожным факультэце і ў інтэрнатах адказных за дастаўку газеты падпісчыкам у дзень яе выхаду».

Да ведама распаўсюджвальнікаў і падпісчыкаў даводзім, што газета «Беларускі універсітэт» выходзіць кожны чацвер і ў першай палавіне дня яе можна атрымаць у камітэце камса мола БДУ. Спадзяемся, што камсамольскі актыў, старасты курсаў паклапоцяцца аб тым, каб студэнты маглі своечасова прачытаць свежы нумар газеты. Супрацоўнікі кафедраў і кабінетаў, якім даручана дастаўка газеты, змогуць забіраць яе (улічыўшы колькасць падпісчыкаў) у бібліятэцы разам з агульнай поштай.

Варта было б у камітэтах камсамола факультэтаў весці падшыўку універсітэцкай шматтыражкі, каб студэнты маглі карыстацца ёю пры падрыхтоўцы лекцый і дакладаў аб універсітэце, выкарыстоўваць даведніцкі матэрыял.

**РЭЙДАВАЯ БРЫГАДА.**

